# Мазырскае кола паэзіі




***21 сакавіка, у Сусветны дзень паэзіі, у Мазырскай цэнтральнай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна сабраліся за адным сталом мясцовыя майстры і аматары паэтычнага слова.***

Пад час знаёмства высветлілася, наколькі розныя і цікавыя людзі сустрэліся на гэтым літаратурным вечары. Кожны прысутны мог крыху расказаць пра сябе, а таксама прачытаць свае, альбо іншых аўтараў, вершы. У мерапрыемстве прынялі ўдзел і такія вядомыя мазырскія паэты, як Аляксандр Каляда і Ганна Крох.

Натхнёныя прыгожым мастацкім словам, усе ўдзельнікі імпрэзы за кароткі час ператварыліся ў шчырае сяброўскае кола.

*Таццяна ПРАКОПЧАНКА*